**ЛЕ́ЛЁ**, Л ё л ё, Л ю л ё, купідон з крыльцамі, які, верагодна, ахоўвае немаўлят у час іх сну. Л. сустракаецца ў песнях, якія спяваюць для закалыхвання дзіцяці:

Ой, Лёлі, Лёлі!
Прыйдзі к дзіцяці
Да дай спаці!
Ой, Лелі, Лелі,
Прыйдзі к пасцелі!
Ой, Люлі, Люлі!
Прысніся Пятрулі!

У народзе сцвярджалі, што ў час такога закалыхвання дзяцей над калыскаю сапраўды лунае ледзьве прыкметны, падобны да туману, Л.

*Літ.*: Д р е в л я н с к и й П. [Шпилевский П.]. Белорусские народные поверья // Журн. М-ва нар. просвещения. 1846. Прибавления. Кн. 1.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ